Я.М.Сахута,
*доктар мастацтвазнаўства*

# НАРОДНАЕ МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

Прыметны рост цікавасці да традыцыйнай культуры, характэрны для сённяшняй Беларусі, абудзіў пачуццё занепакоенасці яе сучасным станам і далейшым лёсам. Мы, нарэшце, усвядомілі, што традыцыйныя народныя песні, абрады, звычаі, промыслы, рамёствы — не адзнака векавой адсталасці або вясковай цемнаты, як гэта нядаўна лічылася, і не выставачна-сувенірная ці сцэнічная экзотыка, як часам лічыцца і сёння. Гэта важнайшая частка нашай нацыянальнай культуры, дзяржаўны набытак, трывалы падмурак, на якім грунтуюцца сучасная культура і мастацтва, набываючы пры гэтым характэрную адметнасць, што вылучае іх на агульнаеўрапейскім фоне.

На шчасце, такая заклапочанасць лёсам народнай мастацкай культуры можа абапірацца на трывалы падмурак многіх глыбока традыцыйных яе відаў, якія яшчэ захаваліся ў Беларусі да нашых дзён ледзь не ў сваёй першароднай чысціні, на разнастайныя сучасныя яе праявы, якія прадаўжаюць і творча развіваюць гэтыя традыцыі.

Здавалася б, наступленне навукова-тэхнічнага прагрэсу ўжо даўно павінна было знішчыць грунт для развіцця народнага мастацтва, рамёстваў, промыслаў з іх перш за ўсё практычнай, утылітарнай скіраванасцю. Сапраўды, сёння адпала практычная патрэба ў саматканай вопратцы, самаробных прыладах працы, посудзе, большасці прадметаў хатняга ўжытку — усяго таго, што адначасова было і аб'ектам мастацкай творчасці. Тым не менш майстры-творцы шукаюць новыя формы іх увасаблення, таму народнае мастацтва і сёння прадаўжае сваё жыццё, арганічна ўключаецца ў сучасныя культурныя працэсы, побыт. Аднак маштабы бытавання яго прыметна звузіліся, яно страціла сваю колішнюю масавасць. Сёння



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэта занятак асобных народных майстроў, для якіх мастацкае рамяство не столькі жыццёвая патрэба, колькі покліч душы, прага творчасці. Таму ў многіх выпадках сучаснае народнае мастацтва мяжуе з самадзейнасцю, але па-ранейшаму яго вызначальнымі крытэрыямі з'яўляюцца традыцыйнасць і калектыўнасць творчасці.

Прыметна змяніўся і характар сучаснага народнага мастацтва. Калі раней яно вызначалася перавагай бытавых, практычных функцый, то зараз бытуюць галоўным чынам тыя яго віды, якія задавальняюць перш за ўсё мастацкія, духоўныя памкненні. Многія вырабы сучасных народных майстроў увогуле страцілі бытавую, практычную скіраванасць, сталі творамі мастацтва, арыгінальнымі, нацыянальна адметнымі сувенірамі.

У сувязі з гэтым вызначаюцца галоўныя асаблівасці сучаснага народнага мастацтва — прыметны рост дэкаратыўнасці, ускладненне формаў вырабаў, узбагачэнне каларыстыкі і арнаментыкі. Гэта, напрыклад, добра відаць на сучасных узорах ткацтва і вышыўкі. Практычна забыліся ўсе традыцыйныя віды геаметрычнай вышыўкі чырвона-белай каларыстыкі з яе старажытнай агульнаславянскай сімволікай матываў і колераў. Непадзельна пануе паліхромная адвольная гладзь, якою аздабляюць як традыцыйныя (ручнікі, абрусы), так і навамодныя вырабы (шторы, парцьеры, накідкі, фіранкі, дарожкі і інш.). Яркія, сакавітыя кветкі, букеты, раслінныя гірлянды ўжо не нясуць ніякай сімвалічнай нагрузкі, гэта яўная дэкаратыўнасць, прызначаная для аздаблення сучаснага інтэр'ера. Вызначыць тут нейкія рэгіянальныя ці хоць бы нацыянальныя асаблівасці — справа марная, паколькі майстрыхі-вышывальшчыцы кіруюцца ўжо не традыцыямі, а ўласнымі ўяўленнямі пра рэалістычнае адлюстраванне навакольнай рэчаіснасці. Тым не менш многія формы гэтага віду творчасці, які існуе ўжо амаль стагоддзе, можна залічыць да сучаснага народнага мастацтва, да чаго схіляюцца большасць спецыялістаў у галіне традыцыйнай культуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэткімі ж паліхроміяй, жыццярадаснасцю, сакавітасцю, багата распрацаванай арнаментыкай, у якой да геаметрычных дадаліся раслінныя, зааморфныя, арнітаморфныя матывы, вызначаецца сучаснае ткацтва. Праўда, яркасць і шматфарбнасць сучасных тканін нярэдка тлумачацца досыць празаічна — адсутнасцю натуральных матэрыялаў, а таксама выкарыстаннем хімічных фарбавальнікаў. Але не ў гэтым прычына. На самай справе яна ў яркасці і квяцістасці сучаснага народнага мастацтва.

Вядома, гэтае рамяство (як, зрэшты, і многія іншыя) даўно ўжо страціла колішнюю масавасць, калі ўмець ткаць павінна была кожная сялянка. Аднак і сёння ткацтва займае вядучае месца ў народнай творчасці. З усіх колішніх ткацкіх тэхнік сучасныя ткачыхі аддаюць перавагу адна- і двухбаковаму перабору, які дае шырокія каларыстычныя і арнаментальныя магчымасці. Не забыта і шматнітовае ткацтва, але традыцыйныя бела-шэрая каларыстыка і характэрны шашачны малюнак саступілі месца паліхромнай, яркай клятчастасці.

Яшчэ жыве традыцыйнае ганчарства, прычым вельмі старажытныя яго праявы, напрыклад чорнае дымленне. Не паспеўшы канчаткова загінуць, адраджаецца традыцыя вырабу гартаванага ("рабога") посуду. Праўда, маштабы рамяства непараўнальныя з колішнімі. Большасць ганчарных цэнтраў даўно заняпалі, у іншых засталіся адзін—два майстры, якія вырабляюць нешырокі асартымент гаспадарчага посуду параўнальна невялікіх аб'ёмаў — збанкі, міскі, вазоны. Аднак рост цікавасці да традыцыйнай культуры, характэрны для нашага часу, стабілізаваў працэс заняпаду ганчарства (як і іншых рамёстваў), нават стымулюе яго адраджэнне. Характэрна, што ў гэтых працэсах усё больш актыўную ролю адыгрывае моладзь.

Прыметна звузіла свае маштабы дрэваапрацоўчае рамяство — калісьці адно з найбольш пашыраных і разнастайных. Даўно выйшла з ужытку бытавая разьба, паколькі амаль цалкам адпала патрэба ў самаробных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

драўляных прыладах працы і прадметах побыту. Жыве хіба толькі архітэктурны дэкор, нават выяўляе тэндэнцыю да ўзбагачэння і пашырэння. Аднак яго перспектывы няпэўныя, паколькі традыцыйнае драўлянае будаўніцтва скарачае свае маштабы, а прымяненне сучасных тэхналогій і матэрыялаў стымулюе развіццё іншых, не звязаных з традыцыяй, відаў і сродкаў дэкору.

Не страціла сваіх пазіцый драўляная скульптура. Праўда, яна ніколі не мела масавага характару (як, дарэчы, і ў іншых народаў), ёю займаліся асобныя майстры-самавукі з прыроднымі задаткамі скульптараў. Гэта ж характэрна і для нашага часу.

Аднак, захаваўшы ранейшыя маштабы бытавання, сучасная драўляная скульптура кардынальна змяніла свой характар. Калісьці, як і ў суседніх народаў Цэнтральнай Еўропы, яна цалкам насіла культавы характар, але жорсткая антырэлігійная палітыка, якая праводзілася ў Беларусі, давяла гэтую тэматыку да поўнага заняпаду. Сучасныя майстры-скульптары звяртаюцца да фальклорных, бытавых, гістарычных сюжэтаў. У большасці выпадкаў, асабліва ў работах майстраў малодшага пакалення, адчуваюцца яўная самадзейнасць, уплыў прафесійнага мастацтва. Але характар сучаснай народнай драўлянай скульптуры вызначаецца перш за ўсё творчасцю майстроў наіўна-рэалістычнага (інсітнага) напрамку, у якой адчуваюцца прамыя ці апасродкаваныя аналогіі з колішняй народнай культавай скульптурай. Такія, напрыклад, манументальна-эпічныя работы І.Супрунчыка (Брэсцкая вобласць), невялічкія фігуркі людзей і жывёл Г.Рабізы (Віцебская вобласць), сцэнкі сельскага побыту М.Рышкевіча (Гродзенская вобласць), І.Тарасюка (Брэсцкая вобласць) і інш. Творчасць гэтых і іншых разьбяроў-скульптараў ярка ілюструе ўжо адзначаны адыход сучаснага народнага мастацтва ад задавальнення бытавых або абрадавых патрэб і ўсё больш прыметную арыентацыю на дэкаратыўнасць і станкавізацыю.

Найбольш ярка гэта відаць на прыкладзе сучаснага саломапляцення, якое па праву лічыцца нацыянальным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гонарам, своеасаблівым феноменам мастацкай культуры Беларусі. Традыцыі выплятання бытавых рэчаў і абрадавай пластыкі з саломы вядомы ўсім земляробчым народам Еўропы, але толькі ў Беларусі іх заняпад разам з адыходам у нябыт ручнога жніва не стаў канчатковым, а набыў новае жыццё, узняўшы колішняе рамяство на недасягальную вышыню. Фігуркі людзей, жывёл, птушак сучасных майстроў саломапляцення, заснаваныя на традыцыях даўняй абрадавай пластыкі з яе лаканічнымі ўмоўнымі формамі, далёка адышлі ад сваіх прататыпаў, аднак генетычнай сувязі з імі не страцілі.

Калі саламяная пластыка, змяніўшы сваё абрадавае прызначэнне на мастацка-сувенірнае, карэнным чынам змянілася пры гэтым як па формах вырабаў, так і прыёмах дэкору, то вырабы утылітарна-дэкаратыўнага прызначэння ілюструюць натуральнае, арганічнае развіццё традыцый. Куфэркі, кошыкі, падносы, фруктоўніцы, у якіх выкарыстаны традыцыйныя вітыя пляцёнкі і рамбічныя ўстаўкі, вызначаюцца хіба толькі большай вытанчанасцю і адпрацаванасцю формаў у параўнанні з колішнімі.

Шырокая папулярнасць саломапляцення, якое стала сімвалам сучаснага беларускага народнага мастацтва, даступнасць і таннасць матэрыялу, тэхналагічная нескладанасць стымулююць актыўнае развіццё і пашырэнне гэтага віду мастацкага рамяства, пошукі ўсё новых і новых формаў вырабаў і прыёмаў дэкору. Разнастайныя галаўныя ўборы, біжутэрыя, кветкі, букеты, вянкі, ёлачныя цацкі і часам самыя нечаканыя вырабы далёка не заўсёды выяўляюць прамыя ці апасродкаваныя аналагі і з традыцыйнай саламянай пластыкай, але яны сведчаць пра багацце і бязмежнасць народнай фантазіі, пастаянную прагу да творчасці, здольнасць чуйна рэагаваць на патрэбы сучаснасці.

Асаблівую папулярнасць набывае выцінанка. Яе традыцыі ў Беларусі страчаны яшчэ з пасляваенных часоў, не захавалася ні музейных калекцый, ні публікацый пра гэта мастацтва. Таму зараз майстры пачынаюць практычна



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з нуля, зыходзячы не толькі з нацыянальных набыткаў, але і з дасягненняў суседніх народаў, з якімі беларусы звязаны агульнымі традыцыямі. Аднак сённяшняя выцінанка наўрад ці адновіць свой аўтэнтычны характар (хоць гэта тэарэтычна магчыма), паколькі страціла сваё колішняе прызначэнне. Цяпер гэта ўжо хутчэй станковыя творы, дэкаратыўныя пано, нярэдка з досыць складанай, багата распрацаванай кампазіцыяй. Выцінанкай сёння займаюцца дзесяткі майстроў, папулярная яна ў школах і нават дзіцячых садах, таму можна спадзявацца, што неўзабаве гэты від народнага мастацтва стане ў Беларусі такі ж пашыраны, як і ў суседняй Польшчы.

Паколькі даўні механізм пераемнасці традыцый (на ўзроўні сям'і, ад бацькоў да дзяцей) зараз практычна страчаны, на першы план вылучаюцца розныя арганізаваныя формы навучання: школы, студыі, гурткі, Дамы рамёстваў і інш. Навучанне ў іх вядзецца або мясцовымі народнымі майстрамі, або спецыялістамі-тэарэтыкамі, якія свядома арыентуюць сваіх навучэнцаў як на мясцовыя, так і на агульнабеларускія традыцыі. Аднак тут вельмі адчувальныя слаба метадычнае забеспячэнне гэтага важнага працэсу, таксама як і недахоп спецыялістаў. Таму не дзіва, што нярэдка праца вядзецца з усімі формамі сучаснай мастацкай творчасці, за народнае мастацтва выдаецца звычайная самадзейнасць або аматарства. Варта нагадаць, што нашы прафесійна-мастацкія вучылішчы (у Міры, Бабруйску, Кобрыне і інш.) і сёння працуюць па расійскіх праграмах з адпаведнымі адносінамі да беларускага матэрыялу.

Кваліфікавана праводзіцца гэтая работа Беларускім саюзам майстроў народнай творчасці. Ён існуе толькі восем гадоў, але здолеў засведчыць сябе канкрэтнымі справамі па захаванні, адраджэнні і папулярызацыі народнага мастацтва, арганізацыі пераемнасці традыцый, аб'яднанні народных майстроў. У саюзе сабраны і лепшыя спецыялісты-тэарэтыкі ў галіне народнай творчасці. Таму не выпадкова для ўсіх, хто хоча бачыць або ствараць сапраўднае народнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтва, своеасаблівай школай майстэрства сталі выстаўкі сучаснай народнай творчасці, якія рэгулярна ладзіць саюз. На яго рахунку таксама заснаванне сістэматычнага правядзення рэспубліканскіх свят-конкурсаў традыцыйных рамёстваў. Ужо праведзены святы саломапляцення, ганчарства, лозапляцення, рыхтуюцца па разьбярстве, выцінанцы і інш. Плённа вядзецца работа па адраджэнні забытых ці заняпалых рамёстваў. Дзякуючы мэтанакіраванай дзейнасці за апошні час адрадзіліся гліняная і драўляная цацка, нізанне бісерам, мастацкая апрацоўка бяросты і інш.

Калі становішча сучаснага народнага мастацтва ахарактарызаваць коратка, то трэба зазначыць, што яно вельмі пагоршылася, і гэта не можа не выклікаць трывогі і заклапочанасці яго лёсам. Адны традыцыі страчаны назаўсёды і наўрад ці знойдуць сваё месца ў сучасным асяроддзі, другім гэтае месца яшчэ трэба знайсці. Да прычын аб'ектыўнага характару, вядомых, бадай, усяму свету (наступ навукова-тэхнічнага прагрэсу, уплыў масавай культуры), далучаюцца і спецыфічна нацыянальныя (эканамічныя цяжкасці, якія перажывае Беларусь, неўпарадкаваны характар грамадскіх адносін, катастрафічнае старэнне вёскі і інш.), што перш за ўсё закранула народных майстроў, асабліва старэйшага пакалення, — апошніх носьбітаў даўніх традыцый. Пакінутыя на волю лёсу, асабліва ў аддаленых вёсках, г. зн. якраз там, дзе народнае мастацтва яшчэ жыве ў сваёй чысціні і натуральнасці, яны часта не бачаць перспектыў сваёй дзейнасці, да іх не заўсёды могуць дацягнуцца спецыялісты — хоць з Міністэрства культуры, хоць з ужо згаданага Беларускага саюза майстроў народнай творчасці.

Не лепшае становішча і ў гарадскіх майстроў. Ва ўмовах хаатычнага пераходу да рынку, развіцця спекулятыўнай камерцыялізацыі народнага мастацтва імкліва расце пагроза канчатковай страты нацыянальных каштоўнасцей. У мастацкіх ацэнках пераважае дылетантызм у спалучэнні са спекулятыўнасцю, калі ўсялякае аматарства падаецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

за народнае мастацтва, што вядзе да яго дэвальвацыі. Найбольш яркі прыклад — паточны выраб сувенірна-мастацкай прадукцыі, якая выдаецца за народныя мастацкія промыслы і суправаджаецца патрабаваннямі адпаведных фінансавых ільгот.

У сувязі са сказаным неабходна прымаць меры па захаванні важнейшай галіны нацыянальнай культуры. Магчыма, гэта павінна быць дзяржаўная праграма яе падтрымкі і адраджэння. Найбліжэйшая і першачарговая задача — прыняцце закона "Аб народных промыслах і рамёствах", праца над якім доўжыцца ўжо не адзін год.

Толькі пры падтрымцы дзяржавы можна рэальна ствараць спрыяльныя ўмовы для адраджэння і развіцця такой важнейшай часткі нацыянальнай культуры Беларусі, якой з'яўляюцца народнае мастацтва, традыцыйныя рамёствы і промыслы.

Р.Ф.Шаура,
*кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар*

## НАРОДНАЕ МАСТАЦТВА Ў КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

Народнае мастацтва як пэўны, самастойны тып творчасці развіваецца па асобных законах цэласнасці і ўяўляе сабой феномен грамадска-гістарычнага і культурнага жыцця народа. Узнікаюць пытанні, у чым заключаюцца асаблівасці яго як часткі агульнай і нацыянальнай культуры і ў чым спецыфічнасць гэтага тыпу мастацкай творчасці. Яны шмат у чым: у функцыі, стылістыцы, прыроднасці, гістарычнасці мастацкай думкі, вобразным змесце, тэматыцы і інш. Народнае мастацтва ў нашы дні — гэта не застылы паўтор адпрацаваных канонаў і ўзораў, а жывы, творчы працэс, цесна звязаны з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ